Падтрымай "Вясну" на PATREON

Футбольных заўзятараў з Мазыра прысудзілі да пазбаўлення волі

23.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні



Затрыманні ў Мазыры футбольных заўзятараў. Скрыншот з відэа МУС

Суд Мазырскага раёна 23 лістапада вынес прысуд па справе мясцовых футбольных заўзятараў Данііла Скіпальскага, Аляксандра Сузько, Паўла Дворака, Аляксандра Цімашэнкі і Кірылы Канапацкага.

Іх абвінавацілі ў арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх **(ч.1. арт 342 Крымінальнага кодэкса)** і ў гвалце альбо пагрозе ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў **(арт. 364 КК РБ)**.

Справу разглядала суддзя **Галіна Кніжонак**, дзяржабвінавачванне прадстаўляла пракурорка **Юлія Какорына.**

На самым першым судовым пасяджэнні, якое адбылося яшчэ 30 верасня, па хадайніцтве дзяржабвінавачання працэс зрабілі закрытым для сваякоў, грамадскасці і журналістаў..

Беларускай праваабарончай супольнасцю трое з іх – **Данііл Скіпальскі, Аляксандр Сузько і Павел Дворак** 18 траўня былі прызнаныя палітычнымі зняволенымі.



Масавыя затрыманні футбольных заўзятараў у Мазыры

Пра 11 затрыманых у Мазыры 5 траўня паведаміла прэсавая служба МУС. Паводле версіі сілавікоў, 10 хлопцаў, якіх затрымалі 4 траўня з дапамогай ГУБАЗіКу і САХР, бралі ўдзел у масавых беспарадках у жніўні 2020 года.

Агулам, 4 траўня было затрымана 10 ўдзельнікаў «каляфутбольнай групоўкі праварадыкальнай накіраванасці». Прэсавая служба ГУУС Гомельскага аблвыканкаму ў сваім відэа заявіла, што ўсе яны пад час 11 жніўня 2020 года выкарыстоўвалі супраць міліцыянтаў газавыя балончыкі, кідалі ў іх камяні.

Вядома таксама, што трох жыхароў Мазыра, абвінавачаных ва ўдзеле ў масавых беспарадках у жніўні 2020 года, вызвалілі з-пад варты пад падпіску аб нявыездзе. З-за кратаў тады выйшлі **Вадзім Свінціцкі, Сяргей Годнеў і Уладзімір Панфіленка**. Яны дагэтуль застаюцца падазраванымі па справе.

Афіцыйная версія падзей


Па словах былой прэс-сакратаркі МУС **Вольгі Чамаданавай**, установлена, што ўвечары 11 жніўня на бульвары Юнацтва агрэсіўна настроеныя асобы распылялі ў праваахоўнікаў газавыя балончыкі, кідалі ў іх камяні. У выніку адзін супрацоўнік пацярпеў, а службовыя аўтамабілі - пашкоджанымі. Спыняць парушальнікаў прыйшлося папераджальнымі стрэламі ў паветра.

> *"Вядома, што дзесяць фігурантаў (ад 18 да 27 гадоў) ўваходзяць або раней ўваходзілі ў мясцовую каляфутбольны групоўку праварадыкальнай накіраванасці. Шасцёра з іх беспрацоўныя, яшчэ чацвёра - судзімыя за крадзяжы, рабаванні, хуліганства і ўхіленне ад мерапрыемстваў прызыву на вайсковую службу. Аднаму з падазраваных 54 гады, ён не ўваходзіць у групоўку",* - распавяла прэс-сакратарка.

Што вядома пра абвінавачаных?

Данііл Алегавіч Скіпальскі - жыхар Мазыра, футбольны фанат, затрыманы 4 траўня з дапамогай ГУБАЗіКу і САХР. Яму прад'яўлена абвінавачванне па арт. 342 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаць грамадскі парадак). Гэтая крымінальная справа распачата за акцыі пратэсту, якія адбываліся ў горадзе ў жніўні 2020 года пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Данііл узяты пад варту і да суда ўтрымліваўся ў СІЗА №3 Гомеля.



Данііл Скіпальскі

Павел Міхайлавіч Дворак - футбольны фанат, сябраваў з астатнімі затрыманымі. Пасля затрымання 4 траўня было прад'яўленае абвінавачванне па арт. 342 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаць грамадскі парадак). Утрымліваўся ў СІЗА №3 Гомеля.

Аляксандр Сузько – таксама з Мазыра і заўзеў за ФК "Славія". Быў затрыманы 4 траўня з дапамогай ГУБАЗіКу і САХР.



Аляксандр Сузько

Інфармацыя пра іншых асуджаных высвятляецца.

12 лістапада “Палеская Вясна” паведаміла, што прадстаўнік дзяржабвінавачвання Юлія Какорына прапанавала суду вынесці ўсім абвінавачваным пакаранне, звязанае з паўбаўленнем волі: **па тры гады калоніі агульнага рэжыму**. Таксама маладзёны павінны будуць выплаціць матэрыяльную кампенсацыю начальніку аддзялення Дзяржаўтаінспекцыі **Валянціну Піллеру,** прызнанаму па справе пацярпелым, па 3000 рублёў кожны.

Прысуд вынесены прадказальна жорсткі: **суддзя Галіна Кніжонак пакарала Данііла Скіпальскага, Аляксандра Сузько, Паўла Дворака, Аляксандра Цімашэнку пазбаўленнем волі тэрмінам на тры гады ў калоніі агульнага рэжыму, Кірыла Канапацкага пазбаўленнем волі на тры гады і шэсць месяцаў.**

Матэрыяльная кампенсацыя пацярпеламу начальніку аддзялення Дзяржаўтаінспекцыі **Валянціну Піллеру** паменшаная да 1500 рублёў з кожнага асуджанага.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

"Беларусі пахваліцца няма чым". У Вене прайшла кансультацыя пра мірныя пратэсты


Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У палітвязня ў турме здарыўся інфаркт і інсульт. Яго адправілі ў калонію

"А ў чым мне прызнаваць віну?" Гісторыя палітвязня з чырвонай біркай

Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 23 палітычных зняволеных

За распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў і абразу Лукашэнку асудзілі жыхара Ліды

"Я не асуджаная, я ў палоне". Маналог Алены Лысковіч — былой палітзняволенай пасля "хіміі"

"Сканаванне і фатаграфаванне віду на жыхарства з'яўляецца абмежаваннем правоў", — юрыст пра праверкі беларусаў на мяжы

Жанчыну асудзілі на два гады "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

За пратэсныя паведамленні ў тг-чаце "Фаніпаль" мужчыну асудзілі на паўтара года "хатняй хіміі"

Затрыманні ў Магілёве, новыя "экстрэмісцкія матэрыялы": хроніка пераследу 1-2 чэрвеня (дапоўнена)

У Мінску асудзілі навукоўца і прафсаюзнага актывіста Аляксандра Кандрацюка


Маладую дзяўчыну ў Мінску яшчэ асудзілі па "народным" артыкуле на два гады "хатняй хіміі"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская Группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY